■ Выбары–2015

## НАЗІРАННЕ БЕЗ ЦІСКУ

Старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына на канферэнцыі АБСЕ ў Вене заявіла, што інстытут міжнародных наглядальнікаў не павінен выкарыстоўвацца для націску на дзяржавы, пры ўмове выканання абавязацельстваў, накіраваных на захаванне міру і бяспекі.

«Наглядальнікам пры ацэнцы выбараў трэба ўлічваць нацыянальнае заканадаўства», — сказала Лідзія Ярмошына падчас абмеркавання пытанняў аб удасканаленні выбарчага заканадаўства і практыкі падрыхтоўкі і правядзення выбараў на канферэнцыі АБСЕ.

## ПОДПІСЫ БЕЗ ПРЫМУСУ

Сёння, 22 ліпеня, — апошні дзень утварэння тэрытарыяльных камісій. Вылучэнне прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных (абласных, Мінскую гарадскую, раённыя, гарадскія (у гарадах раённага падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым дзяленнем), раённыя ў гарадах камісіі) было завершана ў нядзелю, 19 ліпеня. Вылучэнне прадстаўнікоў ва ўчастковыя камісіі пачнецца пасля ўтварэння ўчасткаў для галасавання і працягнецца да 23 жніўня 2015 года ўключна.

Заўтра, 23 ліпеня, ініцыятыўныя групы пачынаюць збор подпісаў па вылучэнні кандыдатамі ў Прэзідэнты. Для рэгістрацыі кандыдатам павінна быць сабрана не менш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў. Ставіць у падпісных лістах свае подпісы ў падтрымку асобы, якая прапануецца для вылучэння, маюць права грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў і валодаюць выбарчым правам. Выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў Прэзідэнты, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры.

Збор подпісаў выбаршчыкаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Дазволу на пікетаванне для гэтых мэт не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, якія не забаронены мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме. Пры зборы подпісаў у інтэрнатах члены ініцыятыўнай групы павінны захоўваць правілы ўнутранага распарадку.

Падчас збору подпісаў забараняецца прымус і ўзнагароджанне выбаршчыкаў. Выбарчым заканадаўствам таксама забаронены ўдзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў падчас працоўнага часу. Нельга збіраць подпісы і падчас службовых камандзіровак.

Члены ініцыятыўнай групы не маюць права пры зборы подпісаў раздаваць выбаршчыкам друкаваныя матэрыялы. Інфармацыя пра біяграфію асобы, у падтрымку якой збіраюцца подпісы, можа быць прадастаўлена толькі для азнаямлення.

Збор подпісаў будзе доўжыцца да 21 жніўня ўключна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## СІТУАЦЫЮ Ў ГАНДЛІ НЕАБХОДНА ВЫПРАВІЦЬ

### Дэпутаты гатовы садзейнічаць росту тавараабароту паміж Беларуссю і Кыргызстанам

**У гэтым Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка запэўніў новага пасла Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі Кубанчыбека Амураліева на сустрэчы ў беларускім парламенце.**

Кіраўнік ніжняй платы павіншаваў спадара Амураліева з прызначэннем на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Кыргызскай Рэспублікі ў Беларусі.

— Мы ўпэўнены, што ваш багаты вопыт дыпламатычнай работы дазволіць яшчэ больш пашырыць нашы сяброўскія сувязі, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Беларусь надае вялікую ўвагу супрацоўніцтву з вашай краінай.

Спікер нагадаў, што беларускі парламент адным з першых ратыфікаваў Дагавор аб далучэнні Рэспублікі Кыргызстан да Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Думаю, што далучэнне да гэтага дагавора адкрые новыя перспектывы, у тым ліку і для Кыргызстана, бо каля 40% вашага экспарту прыпадае на краіны Еўразійскага эканамічнага саюза, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

Разам з тым беларуска-кыргызскія эканамічна-гандлёвыя адносіны апошнім часам пагаршаюцца. У 2014 годзе тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў $95 млн, што на 14% менш, чым у 2013 годзе. За пяць месяцаў гэтага года мы ўвогуле нагандлявалі толькі на $16 млн. У сувязі з гэтым адной з важных задач і для парламентарыяў, і для дыпламатаў Андрэйчанка назваў павелічэнне тавараабароту паміж Беларуссю і Кыргызстанам. «Ён у нас быў $230 млн у 2011 годзе, і думаю, што гэта не мяжа, — заўважыў спікер ніжняй палаты. — Нам трэба не толькі гандляваць, але і больш працаваць па кааперацыі, стварэнні сумесных прадпрыемстваў, зборачных вытворчасцяў. Парламентарыі гатовы садзейнічаць гэтым праектам. Нашы дэпутаты ўдзельнічаюць у рабоце міжурадавых камісій. І добра, што сёлета міжурадавая беларуска-кыргызская камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве аднавіла сваю работу пасля сямігадовага перапынку».

Парламенцкія адносіны з Кыргызстанам Уладзімір Андрэйчанка ахарактарызаваў як канструктыўныя. Старшыня ніжняй палаты перадаў просьбу кіраўніку кыргызскага парламента накіраваць прадстаўнікоў у склад назіральных місій парламенцкіх асамблей АДКБ, АБСЕ і Савета Еўропы, якія ўжо запрошаны для назірання за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 11 кастрычніка гэтага года. «Мы жадаем, каб гэта было маштабнае назіранне, з нашага боку ніякіх абмежаванняў ва ўдзеле міжнародных назіральнікаў не будзе», — запэўніў спікер.

Спадар пасол у сваю чаргу падзякаваў беларускім дэпутатам за падтрымку Дагавора аб далучэнні Кыргызстана да Дагавора аб ЕАЭС і пагадзіўся, што саюзніцкія адносіны падштурхнуць гандлёва-эканамічныя сувязі нашых краін. Кубанчыбек Амураліеў таксама выказаў надзею на актывізацыю ўзаемаадносін Беларусі з Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва ў сувязі з павышэннем статусу нашай краіны ў гэтай арганізацыі да ўзроўню назіральніка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

## ЗНАЙСЦІ АСНОВУ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Адказваючы на пытанні журналістаў аб магчымым візіце прэзідэнта Сербіі Таміслава Нікаліча, Івіца Дачыч пацвердзіў гэту інфармацыю, але «з-за шчыльнага графіка кіраўнікоў дзяржаў канкрэтная дата яшчэ не вызначана». У сваю чаргу Уладзімір Макей падкрэсліў, што Сербія з'яўляецца ключавым партнёрам Беларусі на Балканах, і пакуль гэта адзіная краіна ў далёкім замежжы, з якой у Беларусі заключана пагадненне аб зоне свабоднага гандлю. За апошнія 6 гадоў узаемны тавараабарот дзяржаў павялічыўся ў 6 разоў, а сёлета — на 35%.

Учора Івіца Дачыч таксама ўзяў удзел у пасяджэнні кантактнай групы па Украіне. Па яго словах, дасягнута дамоўленасць па адводзе танкаў і пэўных відаў узбраення калібрам да 100 мм. Згодна з ёй будзе дакладна вызначана, хто з бакоў і па якой схеме адвядзе ўзбраенне ад лініі судакранання.

Што тычыцца мясцовых выбараў на Данбасе, якія павінны адбыцца гэтай восенню, кантактная група пакуль не прыйшла да згоды. Старшыня АБСЕ таксама дадаў, што застаюцца нявырашанымі гуманітарныя і эканамічныя пытанні. Але незалежна ад гэтага «неабходна паважаць мінскія дамоўленасці» і выконваць іх, падкрэсліў дыпламат.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

## НЕ СКАРГАЙ АДЗІНАЙ...

### Многія тэлефануюць паўторна, але не з чарговай просьбай, а з падзякай

**Як сведчаць водгукі, тэлефонныя «прамыя лініі», што праводзяцца на Міншчыне, запатрабаваны ў жыхароў. З пачатку года падчас іх у райвыканкамы і Жодзінскі гарвыканкам паступіла 2148 званкоў, а ў Мінаблвыканкам — 750. З аднаго боку, гэта сведчанне даверу да абласных улад. Але ж... Многія пытанні можна было б вырашыць непасрэдна на месцах. Ды некаторыя заяўнікі, відаць, лічаць, што чым вышэйшая інстанцыя, тым большая гарантыя, што іх «бяду» рукамі развядуць. На жаль, такую псіхалогію цяжка пераламаць адначасна. Неабавязкова звяртацца ў вобласць, каб адрамантаваць, напрыклад, казырок пад'езда. З гэтай праблемай паспяхова справяцца мясцовыя камунальнікі.**

Па даручэнні старшыні Мінаблвыканкама Сямёна Шапіры ў кожным раёне складзены і надрукаваны ў мясцовых сродках масавай інфармацыі спісы чарговасці газіфікацыі вуліц, населеных пунктаў, капітальнага рамонту жылых дамоў, уладкавання дарог, падвядзення камунікацый да прыватных забудоў, добраўпарадкавання двароў і іншае. Такі падыход мае на ўвазе празрыстасць, прынцып справядлівасці і роўнасці. Ды знаходзяцца вельмі дасціпныя заяўнікі, якія хацелі б абысці чаргу. Між іншым, ніводзін з кіраўнікоў, што выслухоўвае іх звароты, не дае неабгрунтаваных абяцанняў: правіла, агульнае для ўсіх.

На «прамую лінію» часта звяртаюцца грамадзяне з пытаннямі, якія немагчыма вырашыць адразу. Яны патрабуюць карпатлівага аналізу, дэталёвага вывучэння з выездам на месца зацікаўленых службаў, спецыялістаў. Да таго ж, заяўнікі не заўсёды дакладна абмалёўваюць сітуацыю, даводзіцца цярпліва высвятляць дэталі, сутнасць звароту. Здараецца і так, што чалавек перабольшвае праблему, а то і наогул, як потым становіцца вядома, хітрыць, падманвае. Так, у Мінаблвыканкам звярнулася жанчына з Заслаўя. Гаспадыня вырошчвае гародніну на прысядзібным участку, а прадаваць няма дзе. У Мінскім райвыканкаме, маўляў, абяцалі вызначыць месцы для гандлю, але не зрабілі гэтага. Старшыня райвыканкама паведаміў, што ў Заслаўі спецыяльна адведзены месцы, дзе можна прадаць прадукцыю з асабістага падворка. Для гэтага неабходна звярнуцца ў адміністрацыю гандлёвага цэнтра для заключэння дагавора арэнды. З Маладзечна паскардзіліся на якасць будаўніцтва дома: вентыляцыя прамярзае, у кватэры цвіль. Маўляў, у недаробках вінаватыя праекціроўшчыкі. На самой справе выявілася, што на кухні вентыляцыйны канал працуе не на поўную магутнасць: на тры чвэрці закрыты выцяжкай. У гэтым вінаваты самі гаспадары. Разам з тым праектнай арганізацыі даручана пракантраляваць сітуацыю ў зімовы перыяд. І ў тым выпадку, калі на столі будуць з'яўляцца плямы, прадугледзець варыянты, як вырашыць праблему.

— Бясспрэчна, ёсць пытанні, якія не патрабуюць вялікіх фінансавых затрат і высілкаў. Яны вырашаюцца хутка, — распавяла **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Мінаблвыканкама Аксана ТАРАНДА.** — Жыхары Мачулішчаў скардзіліся на стан каналізацыйных сетак. Спецыялісты правялі пазапланавую прамыўку сістэмы, і цяпер яна працуе ў штатным рэжыме. З Сеніцы патэлефанавалі, што дрэнна працуе вентыляцыйная сістэма. Цяпер яна прачышчана. Вілейская жыллёва-камунальная гаспадарка паведаміла, што выкананы работы па адводзе вады з участка заяўніцы. Салігорскі райвыканкам даў адказ, што праведзены ямачны рамонт пад'езду да дома №61 па вуліцы Кастрычніцкай, тут устаноўлены сметніцы, пафарбаваны лаўкі. Бацькі вучняў Смалявіцкай сярэдняй школы №2 паскардзіліся на недахоп гурткоў па інтарэсах для малых. У выніку індывідуальнаму прадпрымальніку прадастаўлена ў арэнду памяшканне для правядзення заняткаў для дзяцей малодшага школьнага ўзросту на базе ўстановы адукацыі. Пасля гэтага з такой жа просьбай звярнуліся і бацькі выхаванцаў школы №3. Раённы аддзел адукацыі накіраваў у выканкам пісьмо для ўзгаднення дагавора арэнды, дазвол атрыманы.

**Ніводзін з кіраўнікоў, што выслухоўвае звароты, не дае неабгрунтаваных абяцанняў: правіла агульнае для ўсіх.**

Сапраўды, дзякуючы «прамым лініям» жыхары вобласці атрымліваюць і кампетэнтныя адказы на ўсе запыты, а многія, калі іх прэтэнзіі, скаргі абгрунтаваныя, дапамогу. Знаходзяцца і тыя, хто не забывае патэлефанаваць паўторна, але не з чарговай просьбай, а з падзякай. У прыватнасці, жыхарка Смалявіч знайшла час, каб выказаць словы ўдзячнасці за добраўпарадкаванне пад'езда да шматкватэрнага дома, дзе яна пражывае.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## Запытаць і вырашыць

Ужо традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі не губляюць папулярнасці. Жыхароў краіны цікавяць як сезонныя праблемы, так і тэмы, актуальныя круглы год: пытанні ЖКГ, адукацыі, транспарту і жылля. Кожны тыдзень на прамыя «гарачыя тэлефоны» звяртаецца каля тысячы жыхароў краіны. Многія пытанні атрымліваецца вырашыць фактычна адразу. Чарговая сувязь будзе наладжана і ў гэтую суботу, 25 ліпеня, з 9.00 да 12.00.

**На званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**

намеснік старшыні ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч (80162213121),

**Віцебскі аблвыканкам**

старшыня ШАРСТНЁЎ Мікалай Мікалаевіч (80212204260),

**Гомельскі аблвыканкам**

намеснік старшыні ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80232751237),

**Гродзенскі аблвыканкам**

першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644),

**Мінскі аблвыканкам**

намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160),

**Магілёўскі аблвыканкам**

старшыня абласнога Савета дэпутатаў ІСАЧЭНКА Анатоль Міхайлавіч (80222501869)

**Мінскі гарвыканкам**

намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

Нагадаем, у Беларусі ў бягучым годзе арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

■ Кашалёк

## НЕАБГРУНТАВАНАГА РОСТУ ЦЭН НЕ БУДЗЕ

**Пра гэта паведаміла намеснік міністра гандлю Беларусі Ірына Наркевіч, якая адзначыла, што сёлета па тых групах тавараў, цэны на якія рэгулююцца Мінгандлю, цэннікі ўвогуле засталіся стабільнымі.**



Такія завалы на пошце нам не пагражаюць, прынамсі пакуль.

### У РЭЖЫМЕ РЭКАМЕНДАЦЫЙ

У прыватнасці, яна адзначыла, што цяпер Міністэрства гандлю працягвае кантраляваць змяненне цэн на спажывецкія тавары і патрабуе не допускаць іх неабгрунтаванага росту. А па рэгуляваных групах тавараў павышэння коштаў не было з пачатку года. Больш за тое, сёння Мінгандлю вызначыў памеры гандлёвых надбавак (у якасці рэкамендацый) на нерэгуляваныя віды тавараў, прапанаваў рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і мясцовым выканаўчым органам і канцэрнам наладзіць сістэмную работу ў падведамасных арганізацыях па зніжэнні выдаткаў вытворчасці ў мэтах недапушчэння росту коштаў на сваю прадукцыю.

Паводле слоў Ірыны Наркевіч, ведамства пастаянна ажыццяўляе кантроль за сітуацыяй на спажывецкім рынку і сочыць за ростам цэн на тавары. Сёння гэтая сітуацыя стабільная, упэўнена намеснік міністра, што пацвярджаецца статыстычнымі звесткамі. Напрыклад, сёлета ў студзені інфляцыя склала 2,4%, у лютым — 1,7%, у той жа час курс долара за першы месяц года павялічыўся амаль на 30%. «Пасля стабілізацыі сітуацыі на валютным рынку інфляцыя ў краіне штомесяц не выходзіць за параметр ў 1%. Так, у сакавіку гэты параметр склаў 0,8%, у красавіку — 0,9%, а ў маі і чэрвені — 0,7%», — патлумачыла Ірына Наркевіч.

Мінгадлю больш не збіраецца проста сачыць за дзеяннем розных аператараў на спажывецкім рынку, а будзе актыўна кантраляваць выкананне заканадаўства аб цэнаўтварэнні. А пры неабходнасці можна і карэктаваць узровень рэгуляваных гранічных максімальных гандлёвых надбавак да адпускных цэн на сацыяльна значныя тавары для арганізацый гандлю ўсіх формаў уласнасці і падпарадкаванасці. Паводле яе слоў, адной з дзейсных мер з'яўляецца аператыўнае ўвядзенне цэнавага рэгулявання тэрмінам на 90 дзён на вызначаны пералік сацыяльна значных тавараў у выпадку ўзнікнення крытычнай сітуацыі на спажывецкім рынку па канкрэтнай таварнай пазіцыі. Акрамя таго, міністэрства лічыць мэтазгодным рэгулярна праводзіць стокавыя акцыі, кірмашы-распродажы айчынных тавараў па зніжаных цэнах.

### БЕЗ АЖЫЯТАЖУ І ДЭФІЦЫТУ

Галоўным вынікам працы гандлёвай галіны ў першым паўгоддзі Ірына Наркевіч лічыць захаванне стабільнай сітуацыі на ўнутраным спажывецкім рынку, калі назіраецца шырокі асартымент харчовых і нехарчовых тавараў, у большай частцы айчыннай вытворчасці. Калі няма дэфіцыту, то і адсутнічае ажыятаж, лічыць спадарыня Наркевіч.

Паводле яе слоў, галіна актыўна развіваецца, што пацвярджаецца перавыкананнем прагнозных тэмпаў росту рознічнага тавараабароту ў супастаўных цэнах. Так, у 2011 годзе ён склаў 109%, у 2012 годзе — 114,1%, 2013 — 118%, у 2014 годзе — 106%. Атрымліваецца, што за апошнія 5 гадоў рознічны тавараабарот у супастаўных цэнах павялічыўся у 1,6 раза.

Ірына Наркевіч падкрэсліла, што цяпер доля гандлю ў ВУП краіны складае 12,2%, а гэта другое месца сярод галін эканомікі пасля апрацоўчай прамысловасці. «У краіне цяпер назіраюцца станоўчыя тэмпы развіцця галіны — рост рознічнага тавараабароту ў першым паўгоддзі сёлета склаў 101,1%», — адзначыла Ірына Наркевіч. Вядома, што ў І квартале сёлета ў гандаль прыцягнута каля 268 млн долараў, ці 26,7% ад агульнарэспубліканскага аб'ёму прамых замежных інвестыцый. А менавіта стабільны прыток замежнага капіталу на працягу апошніх гадоў стаў добрай асновай для далейшага развіцця.

### ІМПАРТ ЗМЕНШЫЦЬ ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ

Для ажыццяўлення больш актыўных продажаў уласнай прадукцыі Мінгандлю выступае за ўвядзенне льготнага спажывецкага крэдытавання айчынных тавараў.

Менавіта ў мэтах павелічэння долі продажаў прадукцыі айчыннай вытворчасці, зніжэння імпарту такіх тавараў, а таксама для сацыяльнай падтрымкі насельніцтва міністэрствам падрыхтаваны праект указа, які прадугледжвае прадастаўленне льготных спажывецкіх крэдытаў у парадку, у асноўным аналагічным Указу ад 6 ліпеня 2009 г №371.

Разам з тым Ірына Наркевіч адзначыла, што Мінгандлю сумесна з галіновымі ведамствамі і канцэрнамі, вытворцамі і арганізацыямі гандлю выкарыстоўваецца шэраг захадаў для прыярытэтнага забеспячэння ўнутранага рынку менавіта айчыннай прадукцыяй ва ўмовах максімальнай яго адкрытасці. Паводле яе слоў, сёння доля айчынных тавараў на ўнутраным рынку істотна пераважвае. А па харчовай групе ён больш чым на 80% забяспечваецца за кошт айчыннай прадукцыі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Дарэчы

### Пакупнікі замежных інтэрнэт-крам могуць трапіць пад дадатковы збор

**Ідэю аб увядзенні збору пры куплі тавараў у замежных інтэрнэт-крамах зноў агучыла ўчора намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч.**

На яе погляд, Мінгандалю і міжнародная практыка стаяць на абароне ўнутранага рынку. Міністэрства ў першую чаргу зацікаўлена, каб развіваўся дробны гандаль айчыннымі таварамі і праз нашы анлайн-крамы. А для гэтага трэба распрацаваць спецыяльны ахоўны механізм на рынку, лічыць намеснік міністра. Паводле яе слоў, «цяпер абмяркоўваюцца методыка збірання, сума такога збору і г.д». Нядаўна Нацбанк даручыў камерцыйным банкам разгледзець тэхнічную магчымасць збірання дадатковага збору з фізічных асоб пры куплі тавараў у замежных інтэрнэт-крамах. Аднак банкі адказалі рэгулятару, што не маюць тэхнічнай магчымасці браць такі падатак у момант аплаты карткай. Праўда, такі адказ Мінгандлю не задаволіў.

Ірына Наркевіч адзначыла, што спяшацца з укараненнем такой ініцыятывы не варта, а трэба дасканала вывучыць міжнародны вопыт, адаптаваць яго на беларускі рынак, улічваць асаблівасці Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэта так, але ад самой ідэі ўвядзення дадатковага збору ў Мінгандлю не адмаўляюцца.

НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

## ЭКАНОМІКА ЧАКАЕ...

### Станоўчая тэндэнцыя па першым паўгоддзі назіраецца ў сельскай гаспадарцы і будаўніцтве жылля

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, валавы ўнутраны прадукт краіны сёлета ў студзені-чэрвені склаў 404,5 трлн рублёў.**

Спецыялісты камітэта адзначаюць, што за гэты час прамысловай прадукцыі было выраблена на агульную суму 352,14 трлн рублёў, што на 7,4% менш, чым за студзень — чэрвень летась. Удзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай склала 13,2%. Між іншым, сёлета сельскагаспадарчай прадукцыі (у гаспадарках усіх катэгорый) выраблена на 42,1 трлн рублёў. У выніку прырост да першага паўгоддзя летась склаў 2,7%.

Эксперты адзначаюць, што ў студзені-чэрвені за кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 2 млн 747,8 тысячы квадратных метраў жылля, што на 1,4% больш у параўнанні з адпаведным перыядам летась.

**Сяргей ПАЛІНІН.** *kurkach@zviazda.by*

## А МЫ ЯЧМЕНЬ УЖО ЎБРАЛІ!

**Як паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, ураджайнасць азімага ячменю ў Беларусі сёлета вышэйшая за мінулы год. Яго ўборка па ўсёй краіне завяршаецца. Зжалі ўжо з 7,3 тыс. га, што складае каля 95% ад засеяных плошчаў. Дарэчы, гаспадаркі Мінскай вобласці, якім трэба было прыбраць 0,3 тыс. га, цалкам справіліся з заданнем.**

Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, сёлета сярэдняя ўраджайнасць азімага ячменю складае 43,6 ц/га, што на 2,9 ц/га больш, чым летась. Агульны намалот складае 32 тыс. тон.

Таксама ў гаспадарках Беларусі завяршаецца ўборка азімай свірэпіцы на зерне — яе ўбрана каля 94,2%. Аграрыі паспелі прыступіць да ўборкі азімага рапсу — з 152,4 тыс. га ўжо прыбралі 37,5 тыс. Намалочана больш за 80 тыс. тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 21,5 ц/га, што крыху менш, чым у 2014-м (21,7 ц/га).

Аграрыі ўжо нарыхтавалі 650 тыс. тон сена (46,4% ад плана), 8 млн 831,5 тыс. тон сенажу (65,4%), з якіх 18,2% — у палімернай упакоўцы. Сіласу нарыхтавана пакуль толькі каля 1,6% ад плана, што складае 222 тыс. тон з неабходных 14 млн 91,6 тыс. тон. Травяных кармоў нарыхтавалі каля 35% — 2 млн 918 тыс. тон з запланаваных амаль 8 млн 400 тыс тон.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## ІЛЖЭРАБОТНІЦА ПОШТЫ ПАДМАНУЛА... ВЕТЭРАНА ВАЙНЫ

Махлярка зайшла ў дом 86-гадовага пенсіянера з Лунінецкага раёна, калі той спаў. Разбудзіла мужчыну, сказала, што працуе ў паштовым аддзяленні, прапанавала набыць у яе коўдру і плед. Разгаварыліся — і ветэран Вялікай Айчыннай вайны паказаў госці свае зберажэнні з выплат да 9 Мая і з апошняй пенсіі. Убачыўшы немаленькую суму, ілжэсупрацоўніца адразу ж ажывілася, параіла набыць пенсіянеру дзве коўдры. Цана, аднак, чамусьці вырасла, але жанчына паабяцала, што вялікую частку ад яе яму вернуць праз пошту. «Даверлівы пенсіянер, паддаўшыся чарам махляркі, растаўся з 8 600 000 беларускіх рублёў, — паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці. — Толькі калі няпрошаная госця пакінула дом, у ветэрана ўзніклі падазрэнні...» Распачата крымінальная справа па ч. 1 арт. 209 КК — «Махлярства».

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## КЛЮЧ ДА СЭРЦА І ГРОШАЙ

**Грамадзяніна Грузіі Бачука Цібуа затрымалі ў аэрапорце «Мінск-2», калі ён накіроўваўся адбыць у Тбілісі. Мужчыну 48 гадоў перавезлі ў Гомель, дзе заведзены чатыры крымінальныя справы. Па ўсіх ён праходзіць абвінавачваным у серыі махлярстваў, здзейсненых у горадзе над Сожам.**

Супрацоўнікі ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Гомельскага аблвыканкама сумесна з аператыўнікамі Савецкага РАУС і пры непасрэднай дапамозе мінскіх калег правялі складаную аперацыю па выкрыванні злачынца, які доўгі час знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку.

Цяпер вядома, што ў Гомель яго запрасіла знаёмая праз сацыяльную сетку жанчына. Пакуль гарачы джыгіт быў у абласным цэнтры, ён зачараваў яшчэ дзвюх жанчын. Пацярпелыя заявілі, што грамадзянін завалодаў не толькі іх грашыма, але і залатымі вырабамі. Зараз агульная сума прычыненай шкоды складае больш за $12 тысяч.

Аднак аператыўнікі не выключаюць, што колькасць ахвяр можа быць большай, бо ашуканец гастраляваў па краінах СНД. У сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пацярпелыя ад яго дзеянняў стварылі групу, прысвечаную вышуку Бачука Цібуа. Перадача на гэтую тэму прайшла на адным з тэлеканалаў Украіны. Вядома, што там ён таксама пакінуў крымінальны след. Магчымых ахвяр махляра на даверы праваахоўнікі просяць не саромецца звяртацца ў міліцыю ці Следчы камітэт.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

## КРЫМІНАЛЬНЫ ХАКЕЙ

### Былога генеральнага дырэктара хакейнага клуба «Дынама» падазраюць у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі

**Следчы камітэт ужо завёў крымінальную справу ў дачыненні былога кіраўніка клуба. Справа заведзена па выніках аператыўна-вышуковай дзейнасці Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС РБ.**

У Следчым камітэце паведамілі, што дзеянні экс-дырэктара кваліфікаваны па ч. 3 арт. 424 (злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, якія пацягнулі за сабой цяжкія наступствы ў выглядзе прычынення ўрону ў асабліва буйным памеры).

Падазраваны затрыманы, з ім працуюць следчыя.

З 2013 года генеральным дырэктарам «Дынама» быў Максім Суботкін. 20 ліпеня яго афіцыйна звольнілі з пасады. Фармулёўка — «за грубае парушэнне службовых паўнамоцтваў».

## «ЛІПАВЫЯ» ПАГОНЫ

**Чацвёра жыхароў Міншчыны выкарыстоўвалі міліцэйскую ўніформу, каб рабаваць, гвалціць і здзекавацца з прастытутак. У дачыненні да іх заведзены крымінальныя справы.**

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС РБ паведамілі, што праваахоўнікі звярнулі ўвагу на гэтых асоб (узрост ад 24 да 29 гадоў) яшчэ летась. Падазраваныя пазнаёміліся за кратамі. На волю выйшлі каля двух гадоў таму. Тады і вырашылі здзейсніць даволі спецыфічнае злачынства. Яны разумелі нелегальны статус прастытутак, знаёміліся з імі, а пасля паведамлялі, што «мы — міліцыянеры». Для пераканаўчасці апраналі спецыяльныя кашулі, шаўроны, пагоны, выкарыстоўвалі падробленыя пасведчанні супрацоўнікаў МУС, кабуры з пнеўматычнымі пісталетамі.

Фальшывыя праваахоўнікі адымалі ў жанчын грошы, гвалцілі іх, а пасля вывозілі за горад, дзе пад пагрозай помсты патрабавалі ад іх маўчання. Некаторых утрымлівалі дома па некалькі дзён і здзекаваліся з іх. Падобны «крымінальны квартэт» затрымалі ў чэрвені. Вядома, што ад злачынцаў пацярпелі больш за 10 жанчын. Трое ўдзельнікаў знаходзяцца ў следчым ізалятары №1, яшчэ аднаго адпусцілі пад абавязацельства аб яўцы.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

■ Гучная справа

## ЗАСТРЭЛІЎ ЖОНКУ І ЦЕШЧУ

### За падвойнае забойства лунінчаніну пагражае найвышэйшая мера пакарання

**Трагедыя адбылася ў шматпавярховіку ў цэнтры Лунінца. Каля сямі гадзін раніцы, знаходзячыся ў сябе дома, 42-гадовы лунінчанін застрэліў з паляўнічай стрэльбы жонку і цешчу — 37 і 56 гадоў адпаведна. Відавочцай забойства стала 14-гадовая пляменніца гаспадыні дома, якая напярэдадні прыйшла ў госці да цёткі.**

Пасля злачынства мужчына выбег з кватэры. Стрэльбу выкінуў у суседнім двары па дарозе да знаёмага. Там яго і затрымалі супрацоўнікі міліцыі. У забойцы засталіся двое дзяцей: дачка 18 гадоў, якая пражывае асобна ад бацькоў, і 12-гадовы сын, які ў момант забойства выгульваў сабаку.

«Мужчына абвінавачваецца ў здзяйсненні асабліва цяжкага злачынства па ч. 2 арт. 139 КК (забойства дзвюх асоб), — адзначыў намеснік старшыні Брэсцкага абласнога суда Мікалай Сіз. — Санкцыя артыкула прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 25 гадоў, пажыццёвае зняволенне або смяротнае пакаранне». Справу аб падвойным забойстве разглядае калегія па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда.

**Надзея ПАЎЛАВА.**